# МЕТАДЫЧНЫЯ РЭКАМЕНДАЦЫІ «АРГАНІЗАЦЫЯ ДЗЕЙНАСЦІ МУЗЕЯЎ УСТАНОЎ АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ»

**Агульныя палажэнні**

Грамадзянскае і патрыятычнае выхаванне маладога пакалення з'яўляецца адным з галоўных прыярытэтаў у дзейнасці ўстаноў адукацыі, у аснове якога апора на гісторыю краіны, культурныя і духоўныя традыцыі беларускага народа. Важнае месца ў арганізацыі выхаваўчай работы належыць музею ўстановы адукацыі як цэнтру грамадзянскай, патрыятычнай, культурна-асветніцкай і інфармацыйнай работы з дзецьмі і моладдзю.

Музеі ўстаноў адукацыі прызначаны аб'ектыўна адлюстроўваць мінулае і сучаснасць свайго рэгіёна (краіны), а таксама весці даследчую працу па выяўленні, вывучэнні і захаванні помнікаў матэрыяльнай і духоўнай культуры, прапагандаваць гісторыка-культурныя і прыродныя каштоўнасці.

Дзейнасць музея ўстановы адукацыі рэгулюецца:

Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб адукацыі;

Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб культуры;

іншымі нарматыўнымі прававымі актамі Рэспублікі Беларусь, а таксама лакальнымі нарматыўнымі актамі ўстановы адукацыі.

Асноўнымі накірункамі дзейнасці музея ўстановы адукацыі з'яўляюцца:

камплектаванне і ўлік музейных фондаў у адпаведнасці з устаноўленнымі правіламі;

выкарыстанне фондаў музея ў адукацыйным працэсе;

арганізацыя пошукава-даследчай дзейнасці з мэтай усебаковага вывучэння гісторыі, культуры і прыроды свайго рэгіёна (краіны);

арганізацыя культурна-асветніцкай і грамадска-карыснай дзейнасці сярод удзельнікаў адукацыйнага працэсу (навучэнцаў, іх законных прадстаўнікоў, педагагічных работнікаў установы адукацыі і грамадскасці).

**Арганізацыя работы музеяў устаноў адукацыі**

Музей установы адукацыі з'яўляецца структурным падраздзяленнем установы адукацыі, якое ствараецца з мэтай выяўлення і захавання на пастаяннай аснове музейных прадметаў, навукова-дапаможных

і сыравінных матэрыялаў, іх вывучэння, уліку, экспанавання і папулярызацыі для ажыццяўлення адукацыйных задач установы адукацыі.

Асновай станаўлення музея з'яўляецца стварэнне ва ўстанове адукацыі па ініцыятыве педагогаў, навучэнцаў, грамадскасці асобных экспазіцый, у якіх экспануюцца тэматычныя матэрыялы, сабраныя па выніках краязнаўчых экспедыцый, турысцкіх паходаў, вандровак па малой радзіме ці набытыя іншым шляхам.

Музей ствараецца па рашэнні педагагічнага савета пры абавязковым выкананні наступных умоў:

наяўнасць прадметаў музейнага значэння (не менш 100 музейных прадметаў асноўнага фонду) і канцэпцыі развіцця музея ўстановы адукацыі[1];

выдзеленае асобнае памяшканне (не менш за 20 кв.м.) і абсталяванне, якія забяспечваюць захаванасць і экспанаванне музейных прадметаў, навукова-дапаможных і сыравінных матэрыялаў;

наяўнасць штатнай адзінкі (штатных адзінак) музейнага работніка (кіраўніка музея).

Першачарговым пытаннем пры стварэнні музея з'яўляецца вызначэнне яго профілю[2], які павінен адпавядаць зместу экспазіцый музея ўстановы адукацыі[3]. **Звяртаем увагу,** што профіль музея можа быць зменены, напрыклад калі ў музеі створана новая экспазіцыя, якая не адпавядае раней вызначанаму профілю. Гэта замацоўваецца новым пашпартам, атрыманым ва ўстаноўленным парадку.

Адпаведнасць выканання ўстановай адукацыі патрабаванняў, неабходных для адкрыцця музея, устанаўлівае ўпаўнаважаная камісія (далей – Камісія), якая рыхтуе неабходнае заключэнне.

Ва ўстановах адукацыі раённага (гарадскога) падпарадкавання ствараецца раённая Камісія, склад якой зацвярджаецца загадам кіраўніка структурнага падраздзялення гарадскіх, раённых выканаўчых камітэтаў, мясцовых адміністрацый раёнаў у гарадах, якое ажыццяўляе дзяржаўна-ўладныя паўнамоцтвы ў сферы адукацыі.

Ва ўстановах адукацыі абласнога і рэспубліканскага падпарадкавання – Камісія, склад якой зацвярджаецца загадам кіраўніка ўстановы адукацыі па ўзгадненні з вышэйстаячай арганізацыяй.

Камісія ствараецца і дзейнічае адзін год.

Акрамя гэтага ў функцыі Камісіі ўваходзіць:

---

[1] Канцэпцыя развіцця музея ўстановы адукацыі – дакумент, які з'яўляецца асновай для планавання дзейнасці музея, камплектавання музейнага фонду ў адпаведнасці з яго профілем і вызначае мэты, задачы, прынцыпы функцыянавання, перспектывы і напрамкі развіцця музея, шляхі іх рэалізацыі.

[2] Профіль музея – катэгорыя класіфікацыі музеяў, якая вызначае сувязь музейнай дзейнасці з профільнай дысцыплінай, канкрэтнай галіной навукі, тэхнікі, вытворчасці, відам мастацтва і інш.

[3] Артыкул 161 Кодэкса аб культуры Рэспублікі Беларусь.

вырашэнне пытання аб неабходнасці ліквідацыі музея ўстановы адукацыі;

арганізацыя працэса пашпартызацыі музеяў устаноў адукацыі;

разгледжанне пытання аб аднясенні музейных прадметаў да асабліва каштоўных музейных прадметаў, пераводу музейных прадметаў з асноўнага фонду ў навукова-дапаможны фонд, і аб іх выключэнні з асноўнага фонду.

У склад раённай Камісіі ўваходзяць прадстаўнікі:

абласной (Мінскай гарадской) установы дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі, ДУА «Мінскі абласны інстытут развіцця адукацыі», якія каардынуюць дзейнасць музеяў (старшыня Камісіі па ўзгадненні);

структурных падраздзяленняў гарадскіх, раённых выканаўчых камітэтаў, мясцовых адміністрацый раёнаў у гарадах, якія ажыццяўляюць дзяржаўна-ўладныя паўнамоцтвы ў сферах адукацыі і культуры (па ўзгадненні);

раённай (гарадской) установы дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі, якая каардынуе дзейнасць музеяў.

У склад Камісіі ва ўстановах абласнога і рэспубліканскага падпарадкавання ўваходзяць прадстаўнікі рэспубліканскай і (або) абласной (Мінскай гарадской) установы дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі, ДУА «Мінскі абласны інстытут развіцця адукацыі», іншых устаноў (арганізацый) па ўзгадненні.

У выпадку выяўлення Камісіяй не выканання вышэйадзначаных патрабаванняў, Камісія вызначае тэрмін для ліквідацыі недахопаў або дае заключэнне на неадпаведнасць умовам.

Пры станоўчым заключэнні Камісіі ўстанова адукацыі накіроўвае хадайніцтва аб адкрыцці музея ва Установу адукацыі «Рэспубліканскі цэнтр экалогіі і краязнаўства» (далей – Рэспубліканскі цэнтр) з дадаткам наступных дакументаў:

пратакола заключэння Камісіі аб адпаведнасці музея ўстановы адукацыі ўмовам для яго адкрыцця;

канцэпцыі развіцця музея ўстановы адукацыі;

палажэння аб музеі ўстановы адукацыі;

пашпарта музея ўстановы адукацыі[4].

Адкрыццё музея ўстановы адукацыі без афіцыйнай згоды Рэспубліканскага цэнтра **недапушчальна**.

Асноўным лакальным дакументам, які рэгламентуе дзейнасць музея ўстановы адукацыі з'яўляецца палажэнне. Палажэнне, як і канцэпцыя развіцця музея ўстановы адукацыі, зацвярджаецца кіраўніком установы

---

[4] Узоры вышэйназваных дакументаў размешчаны на сайце Рэспубліканскага цэнтра (https://rcek.by/музеи учреждений образования).

адукацыі. Палажэнне аб музеі ўстановы адукацыі павінна распрацоўвацца з улікам рэгіянальных асаблівасцяў і спецыфікі музея і ўключаць наступныя раздзелы: агульныя палажэнні (паняцце, мэта, задачы, функцыі музея), арганізацыя і кіраванне (парадак стварэння і ліквідацыі музея, вызначэнне профілю музея, напрамкі работы), камплектаванне і ўлік музейных фондаў, правы і абавязкі наведвальнікаў музея, суб'ектаў адукацыйных адносін.

Кожны музей абавязкова павінен мець пашпарт[5]. Пашпарт падпісваецца кіраўніком установы адукацыі і старшынёй Камісіі пры адкрыцці музея і пашпартызацыі[6]. Пашпарт захоўваецца ў музеі, копія пашпарта ў старшыні Камісіі. Раз у пяць гадоў праводзіцца пашпартызацыя музея ўстановы адукацыі.

Канчатковым дакументальным пацверджаннем адкрыцця музея з'яўляецца загад кіраўніка ўстановы адукацыі аб адкрыцці музея ўстановы адукацыі, які афармляецца пасля афіцыйнага ўзгаднення Рэспубліканскім цэнтрам.

Ліквідацыя музея (выключэнне са структуры ўстановы адукацыі) дапускаецца ў выключных выпадках: пры ліквідацыі (аптымізацыі) ўстановы адукацыі, а таксама пры пагрозе захаванасці музейных прадметаў, навукова-дапаможных і сыравінных матэрыялаў.

**Нагадваем,** што неабходнасць ліквідацыі музея разглядае Камісія. Музей закрываецца на падставе загада кіраўніка ўстановы адукацыі пасля заключэння Камісіі. Установа адукацыі павінна накіраваць у Рэспубліканскі цэнтр пісьмо аб закрыцці музея і выключэнні яго з рэспубліканскага банка дадзеных.

**Звяртаем увагу,** што пры ліквідацыі музея ўстановы адукацыі неабходна забяспечыць захаванасць музейнага фонду і перадачу яго іншаму дзяржаўнаму музею (-ям) са складаннем акта перадачы[7]. Дадзенае пытанне вырашаецца па ўзгадненні з Камісіяй.

Для якаснага ўліку музейных фондаў пры ліквідацыі музея або правядзенні рамонтных работ (рэканструкцыі) ва ўстанове адукацыі ствараецца асобная камісія, у склад якой уваходзіць кіраўнік установы адукацыі, кіраўнік музея, іншыя члены па ўзгадненні. Камісіяй складаецца акт зверкі наяўнасці музейных прадметаў, навукова-дапаможных і сыравінных матэрыялаў з уліковай дакументацыяй. Памяшканне, дзе знаходзіцца музейны фонд, апячатваецца.

---

[5] Пашпарт – дакумент, які змяшчае асноўныя звесткі аб музеі ўстановы адукацыі і запаўняецца з мэтай уліку і аналізу яго дзейнасці.

[6] Пашпартызацыя – працэс пацвярджэння адпаведнасці музея ўстановы адукацыі ўстаноўленым патрабаванням да арганізацыі яго дзейнасці.

[7] Форма акта перадачы размешчана на сайце rcek.by (раздзел «Музеи учреждений образования»).

Агульнае кіраўніцтва дзейнасцю музея ажыццяўляе кіраўнік установы адукацыі, які павінен забяспечыць:

адпаведнасць памяшканняў (будынка) музея патрабаванням па захаванні музейнага фонду;

абсталяваннем, фінансавымі, тэхнічнымі і іншымі сродкамі, неабходнымі для ажыццяўлення музейнай дзейнасці;

цэласнасць музейнага фонду.

Кіраўнік музея (педагагічны работнік) нясе адказнасць за выкарыстанне рэсурсаў музея ў адукацыйным працэсе, вядзенне ўліковай дакументацыі ў адпаведнасці з усталяванымі патрабаваннямі, камплектаванне і захаванне музейнага фонду. Кантроль і каардынацыю дзейнасці кіраўніка музея ажыццяўляе намеснік, назначаны дырэктарам. Штатны расклад, умовы і парадак аплаты працы работнікаў музея вызначаюцца ў адпаведнасці с заканадаўствам[8].

На базе музея пад кіраўніцтвам кіраўніка музея арганізуецца работа савета музея, у склад якога могуць уваходзіць: педагагічныя і іншыя работнікі ўстановы адукацыі, навучэнцы і іх законныя прадстаўнікі, прадстаўнікі мясцовых органаў улады, дзяржаўных, грамадскіх і іншых зацікаўленых арганізацый.

Функцыі савета музея:

распрацоўка канцэпцыі развіцця музея і гадавога плана работы;

разгляданне пытанняў уключэння прадметаў музейнага значэння, якія паступаюць у працэсе камплектавання ў асноўны, навукова-дапаможны і сыравінны фонды, пераводу з фонду навукова-дапаможных матэрыялаў у асноўны фонд;

стварэнне пошукавых, фондавых, экскурсійных і іншых груп, якія ўзначальваюць члены савета музея;

разгляд справаздач пошукавых, фондавых, экскурсійных і іншых груп;

арганізацыя вучобы груп (пошукавых, фондавых, экскурсійных і інш.), падрыхтоўка экскурсаводаў музея ўстановы адукацыі, лектараў;

абмеркаванне актуальных пытанняў дзейнасці музея ўстановы адукацыі.

Музею ўстановы адукацыі ў адпаведнасці з рашэннем калегіі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь можа быць прысвоены статус «народны»[9]. Кіраўнік музея павінен **тэрмінова** падрыхтоўваць дакументы для пацверджання статусу кожныя пяць гадоў. Адказнасць за выкананне

---

[8] Трудовой кодекс Республики Беларусь;

Пастанова Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 24 красавіка 2013 г. № 22 «О типовых штатах и нормативах численности работников отдельных учреждений общего среднего и специального образования (в редакции от 22.05.2015 № 42)».

[9] Артыкул 247 Кодэкса аб культуры Рэспублікі Беларусь.

тэрмінаў і падачу неабходных дакументаў ускладаецца на рэгіянальных каардынатараў дзейнасці музеяў установы адукацыі.

**Звяртаем увагу,** што выкананне функцый каардынацыйных і метадычных цэнтраў сеткі музеяў устаноў адукацыі на рэспубліканскім узроўні ажыццяўляе Рэспубліканскі цэнтр, на абласным і раённым узроўнях – профільныя ўстановы дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі, ДУА «Мінскі абласны інстытут развіцця адукацыі», якія з мэтай арганізацыі эфектыўнай работы музеяў устаноў адукацыі і аналізу іх дзейнасці, павышэння прафесійнага майстэрства кіраўнікоў музеяў:

аказваюць метадычную дапамогу ўстановам адукацыі па пытаннях арганізацыі музейнай дзейнасці;

забяспечваюць правядзенне мэтанакіраванай работы па абагульненні і распаўсюджванні перадавога вопыту дзейнасці музеяў устаноў адукацыі;

праводзяць рэгіянальныя (раённыя, гарадскія, абласныя) і рэспубліканскія семінары кіраўнікоў музеяў устаноў адукацыі, школы маладога кіраўніка музея, прэзентацыі перадавога педагагічнага вопыту работы і др. з улікам сучасных тэхналогій;

актуалізуюць і забяспечваюць размяшчэнне на сваіх сайтах інфармацыі аб практычным вопыце музеяў устаноў адукацыі;

ажыццяўляюць маніторынг дзейнасці музеяў устаноў адукацыі ўсіх тыпаў;

прыцягваюць сродкі масавай інфармацыі для асвятлення дзейнасці музеяў устаноў адукацыі.

Кіраўнікам музеяў устаноў адукацыі з мэтай удасканалення іх дзейнасці **рэкамендуецца** прымаць удзел у рэспубліканскім метадычным аб'яднанні арганізатараў музейнай справы, якое дзейнічае на базе Рэспубліканскага цэнтра, выкарыстоўваць матэрыялы паседжанняў дадзенага аб'яднання ў сваёй рабоце. А таксама праводзіць раённыя метадычныя аб'яднанні з удзелам кіраўнікоў музеяў з трансляцыяй эффектыўных практык музейнай работы.

Для арганізацыі ўліку музеяў і фарміравання адзінай базы дадзеных:

раённымі (гарадскімі), абласнымі (Мінскім гарадскім) профільнымі ўстановамі вядуцца рэгіянальныя банкі дадзеных музеяў устаноў адукацыі[10];

юрыдычнай асобай, упаўнаважанай Міністэрствам культуры Рэспублікі Беларусь вядзецца рэестр музеяў[11].

Рэспубліканскі банк дадзеных абнаўляецца Рэспубліканскім цэнтрам на аснове інфармацыі, прадстаўленай абласнымі (Мінскай гарадской)

---

[10] Форма прадстаўлення інфармацыі аб музеях установы адукацыі размешчана на сайце rcek.by.

[11] Артыкул 167 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб культуры;

пастанова Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь ад 25 лістапада 2016 г. № 56 «Аб устанаўленні форм для вядзення рэестра музеяў».

профільнымі ўстановамі. Адказнасць за змест інфармацыі ўскладаецца на кіраўніка ўстановы адукацыі. Інфармацыя накіроўваецца ў Рэспубліканскі цэнтр **штогод да 1 лютага**. Агульны даведнік «Музеі ўстаноў адукацыі Рэспублікі Беларусь» размяшчаецца на сайце Рэспубліканскага цэнтра (https://rcek.by/metodicheskie-materialy/).

**Камплектаванне і ўлік музейных прадметаў, навукова-дапаможных і сыравінных матэрыялаў**

Камплектаванне музейнага фонду[12] з'яўляецца адным з важных напрамкаў музейнай дзейнасці. Кіраўнікам музеяў **неабходна забяспечыць** сістэмную работу па камплектаванні музейных фондаў.

Для арганізацыі дзейснай работы ў дадзеным накірунку кіраўніком музея сумесна з саветам музея штогод складаецца план камплектавання, які змяшчае наступныя раздзелы: тэма ці калекцыя, крыніца паступлення, аб'екты камплектавання, спосаб паступлення, заўвагі.

Музейны фонд[13] уключае ў сябе: асноўны фонд[14], фонд навукова-дапаможных матэрыялаў[15], фонд сыравінных матэрыялаў[16].

**Звяртаем увагу**, што навукова-дапаможныя матэрыялы не валодаюць уласцівасцямі музейнага прадмета, не маюць статусу музейных прадметаў і выконваюць дапаможную функцыю ў працэсе вывучэння, выкарыстання і экспанавання музейных прадметаў.

У мэтах забеспячэння захаванасці і кантролю за музейнымі фондамі **неабходна асаблівую ўвагу** звярнуць на арганізацыю належнага ўнутрымузейнага ўліку музейных прадметаў, навукова-дапаможных і сыравінных матэрыялаў.

Музейныя прадметы асноўнага фонду фіксуюцца ў галоўнай інвентарнай кнізе (кнізе паступленняў музейных прадметаў асноўнага фонду), навукова-дапаможныя матэрыялы – у кнізе ўліку фонду навукова-дапаможных матэрыялаў, сыравінныя матэрыялы – у кнізе ўліку фонду сыравінных матэрыялаў (пры наяўнасці сыравінных матэрыялаў).

Кнігі ўліку павінны быць да запаўнення пранумараваны, прашнураваны, падпісаны кіраўніком установы адукацыі і праштампаваны пячаткай установы адукацыі.

---

[12] Камплектаванне музейных фондаў – мэтанакіраваны, планавы працэс выяўлення і збору прадметаў музейнага значэння ці абмену музейнымі прадметамі, уліку і апісання музейных прадметаў у мэтах фарміравання, папаўнення і захавання музейных фондаў.

[13] Музейны фонд – сукупнасць музейных прадметаў, навукова-дапаможных і сыравінных матэрыялаў, якія пастаянна захоўваюцца ў музеі ўстановы адукацыі.

[14] Асноўны фонд – сукупнасць музейных прадметаў.

[15] Фонд навукова-дапаможных матэрыялаў – сукупнасць навукова-дапаможных матэрыялаў, якія набытыя або спецыяльна выраблены па замове музея для раскрыцця зместу тэм экспазіцыі або выставы.

[16] Фонд сыравінных матэрыялаў – сукупнасць сыравінных матэрыялаў, аб'ектаў прыроднага паходжання, якія прызначаны для лабараторных даследавання і прэпаравання.

Пры паступленні прадметаў у музей абавязкова афармляецца акт прыёму[17] і дагавор. Акт прыёму прадметаў на пастаяннае захоўванне складаецца ў двух экзэмплярах, кожны экзэмпляр зацвярджаецца кіраўніком установы адукацыі, падпісваецца кіраўніком музея і ўладальнікам прадмета музейнага значэння. Адзін экзэмпляр акта прыёму перадаецца ўладальніку прадмета музейнага значэння. Акты прыёму абавязкова рэгіструюцца ў кнізе рэгістрацыі актаў.

Звесткі аб усіх прадметах, якія паступілі ў музей на пастаяннае захоўванне, пасля акціравання, уносяцца ў адпаведную кнігу ўліку. Адначасова з гэтым на музейных прадметах, навукова-дапаможных і сыравінных матэрыялах і ў акце прыёму праставуляюцца адпаведныя ўліковыя абазначэнні (ідэнтыфікацыйныя нумары). Уліковыя абазначэнні наносяцца на тую частку музейнага прадмета, навукова-дапаможнага або сыравіннага матэрыялу, якая не будзе бачнай пры яго экспанаванні.

**Падкрэсліваем,** што кіраўнікам устаноў адукацыі, на базе якіх створаны музейныя экспазіцыі, таксама неабходна забяспечыць улік прадметаў, якія знаходзяцца ў экспазіцыі. Гэта выклікана неабходнасцю забеспячэння захаванасці прадметаў музейнага значэння і якаснай арганізацыі музейнай работы ў выпадку далейшага стварэння музея ва ўстанове адукацыі.

Музейныя прадметы з асноўнага фонду могуць быць выключаны толькі ў выключных выпадках: страты або знішчэння ў выніку надзвычайных сітуацый ці па іншых прычынах[18].

Перавод музейных прадметаў з асноўнага фонду ў навукова-дапаможны фонд ажыццяўляецца пры ўмове, калі музейны прадмет страціў сваю навуковую, гістарычную, мемарыяльную, мастацкую і (або) эстэтычную вартасць. Перавод музейных прадметаў у навукова-дапаможны фонд ажыццяўляецца па рашэнні Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь і афармляецца загадам кіраўніка ўстановы адукацыі.

Перавод навукова-дапаможных матэрыялаў з фонду навукова-дапаможных матэрыялаў у асноўны фонд ажыццяўляецца па рашэнні савета музея, зыходзячы з мэтазгоднасці, у выпадках набыцця музейным прадметам гістарычнай, культурнай каштоўнасці ці ў выніку праведзенага даследавання або з цягам часу і афармляецца загадам кіраўніка ўстановы адукацыі.

Сыравінныя матэрыялы ў залежнасці ад вынікаў апрацоўкі пераводзяцца ў асноўны фонд або ў фонд навукова-дапаможных матэрыялаў па рашэнні савета музея.

---

[17] Форма акта прыёму прадметаў музейнага значэння размешчана на сайце rcek.by.

[18] Артыкул 173 Кодэкса аб культуры Рэспублікі Беларусь.

Перадача музейных прадметаў ад аднаго музея да іншага і ад музея да іншай арганізацыі на пастаяннае або часовае захоўванне ажыццяўляецца на падставе дагавора. Асноўным дакументам для перадачы музейных прадметаў і (або) навукова-дапаможных матэрыялаў на пастаяннае або часовае захоўванне з'яўляецца акт перадачы (на пастаяннае або часовае захоўванне). Акт перадачы рэгіструецца ў кнізе рэгістрацыі актаў.

Доступ да ўліковай дакументацыі кантралюецца кіраўніком музея. Забараняецца знішчэнне і вынас уліковай дакументацыі з музея, акрамя выпадкаў, прадугледжаных заканадаўчымі актамі.

Выкарыстанне музейных прадметаў, навукова-дапаможных і сыравінных матэрыялаў ва ўмовах, якія ствараюць пагрозу іх захаванасці і могуць прывесці да іх пашкоджання, страты або знішчэння, **забараняецца**.

Пры размяшчэнні ў музеях устаноў адукацыі зброі, боепрыпасаў і іншых выбуховапебяспечных прадметаў **неабходна забяспечыць** выкананне патрабаванняў нарматыўных дакументаў[19].

Для бяспечнага функцыянавання музеяў устаноў адукацыі **неабходна** правядзенне агляду музейных прадметаў і навукова-дапаможных матэрыялаў (фрагментаў боепрыпасаў, карпусоў мін, гільзаў, асколкаў снарадаў і г.д.) спецыялістамі тэрытарыяльных органаў Міністэрства ўнутраных спраў, якія павінны даць заключэнне на прадмет магчымасці захоўвання дадзеных прадметаў у экспазіцыі музея ўстановы адукацыі або іх канфіскацыі. Агляд праводзіцца ў прысутнасці кіраўніка ўстановы адукацыі і кіраўніка музея. Па выніках дадзенага агляду складаецца акт[20].

Для раскрыцця зместу тэмы экспазіцыі кіраўнікам музеяў **рэкамендуецца выкарыстоўваць** макеты (муляжы) зброі і боепрыпасаў.

Музеі ўстаноў адукацыі, якія змяшчаюць у сваіх калекцыях прадметы з каштоўных металаў і камянёў, павінны атрымаць ва ўстаноўленым парадку ліцэнзію на дзейнасць, звязаную з каштоўнымі металамі і каштоўнымі камянямі, ці, у мэтах забеспячэння бяспекі,

---

[19] Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 30 жніўня 2002 г. № 473 «О мерах по совершенствованию регулирования оборота боевого, служебного, гражданского оружия и боеприпасов к нему на территории Республики Беларусь»;

Пастанова Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь ад 17 чэрвеня 2003 г. № 17 «Об утверждении Инструкции о порядке учета, хранения и транспортировки оружия и боеприпасов, имеющих культурную ценность, государственными музеями»;

Пастанова Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь ад 29 лістапада 2010 г. № 383 «Об утверждении Правил размещения оружия, его составных частей и компонентов, боеприпасов при осуществлении деятельности, связанной со служебным и гражданским оружием и боеприпасами к нему, коллекционированием и экспонированием оружия и боеприпасов, и признании утратившими силу некоторых постановлений и структурного элемента постановления Министерства внутренних дел Республики Беларусь».

[20] Форма акта агляду музейных прадметаў і навукова-дапаможных матэрыялаў размешчана на сайце rcek.by.

павінны перадаць каштоўнасці ў дзяржаўныя музеі сістэмы Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, якія маюць ліцэнзію, або дзяржаўныя музеі сістэмы Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь са складаннем акта перадачы[21].

Асаблівасці выкарыстання, уліку і захоўвання музейных прадметаў, якія змяшчаюць каштоўныя металы і каштоўныя камяні ўстанаўліваюцца заканадаўствам у сферы дзейнасці з каштоўнымі металамі і каштоўнымі камянямі[22].

Музейныя прадметы, якія пастаянна захоўваюцца ў музеі ўстановы адукацыі, лічацца ўключанымі ў Музейны фонд Рэспублікі Беларусь[23] пасля іх рэгістрацыі ў галоўнай інвентарнай кнізе і з'яўляюцца неад'емнай часткай культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь.

**Забараняецца выкарыстанне** музейных прадметаў, уключаных у Музейны фонд Рэспублікі Беларусь, ва ўмовах, якія ствараюць пагрозу іх захаванасці і (або) могуць прывесці да іх пашкоджання, страты або знішчэння.

Музейныя прадметы, уключаныя ў Музейны фонд Рэспублікі Беларусь, могуць перадавацца на часовае і пастаяннае захоўванне ад аднаго музея да іншага музея толькі на падставе дагавора паміж арганізацыямі, структурнымі падраздзяленнямі якіх з'яўляюцца музеі.

Музейныя прадметы выключаюцца з Музейнага фонду Рэспублікі Беларусь Міністэрствам культуры Рэспублікі Беларусь у выпадку, калі яны:

страцілі сваю навуковую, гістарычную, мемарыяльную, мастацкую і (або) эстэтычную вартасць;

вернутыя ўладальніку па судовай пастанове;

выкрадзеныя, што пацвярджаецца дакументамі адпаведных дзяржаўных органаў;

пашкоджаныя ў такой ступені, што іх немагчыма рэстаўрыраваць;

страчаныя або знішчаныя ў выніку надзвычайных сітуацый або ўзброенага канфлікту ці па іншых прычынах.

Для выключэння музейнага прадмета (-аў) з Музейнага фонду Рэспублікі Беларусь установа адукацыі прадстаўляе ў Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь заяву аб выключэнні музейнага прадмета

---

[21] Пастанова Міністэрства фінансаў Рэспублікі Беларусь ад 15 сакавіка 2004 г. № 34 «Аб зацвярджэнні Інструкцыі аб парадку выкарыстання, уліку і захоўвання каштоўных металаў і каштоўных камянёў».

[22] Пастанова Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь ад 25 лістапада 2008 № 40 «Аб зацвярджэнні Інструкцыі аб парадку ўліку і інвентарызацыі каштоўнасцей культурна-гістарычнага фонду, якія знаходзяцца ў падначаленых Міністэрству культуры арганізацыях, а таксама ў структурных падраздзяленнях мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў, якія ажыццяўляюць дзяржаўна-уласныя паўнамоцтвы ў галіне культуры, і падначленых ім арганізацыях».

[23] Музейны фонд Рэспублікі Беларусь – сукупнасць музейных прадметаў, якія пастаянна захоўваюцца ў дзяржаўных музеях, і асобных прадметаў, якія пастаянна захоўваюцца ў прыватных музеях і ўключаны ў Музейны фонд Рэспублікі Беларусь па пісьмовых заявах уласнікаў музейных прадметаў.

(- аў) з Музейнага фонду Рэспублікі Беларусь[24]. Да заявы дадаюцца: фота, дэфектныя акты.

У мэтах цэнтралізаванага ўліку, ідэнтыфікацыі і папулярызацыі асабліва каштоўных музейных прадметаў, уключаных у Музейны фонд Рэспублікі Беларусь, юрыдычная асоба, упаўнаважаная Міністэрствам культуры, фарміруе і вядзе Дзяржаўны каталог Музейнага фонду Рэспублікі Беларусь[25].

**Адукацыйная дзейнасць музеяў устаноў адукацыі**

Адукацыйная функцыя музеяў устаноў адукацыі рэалізуецца ў працэсе непасрэднага ўдзелу навучэнцаў у ажыццяўленні розных напрамкаў музейнай дзейнасці: фондавай, экспазіцыйнай, экскурсійнай, пошукава-даследчай, грамадска-карыснай і г.д. Праз музейную дзейнасць навучэнцы на практыцы займаюцца выяўленнем, захаваннем і папулярызацыяй гісторыка-культурнай і прыроднай спадчыны свайго рэгіёна, краіны.

Кіраўнікам музеяў **неабходна акцэнтаваць увагу** на эфектыўным выкарыстанні адукацыйнага патэнцыялу музеяў, што будзе садзейнічаць іх станаўленню як рэсурсных цэнтраў устаноў адукацыі па грамадзянскім і патрыятычным выхаванні дзяцей і моладзі, пляцовак для рэалізацыі інтэлектуальных, творчых здольнасцяў навучэнцаў.

Назапашаны матэрыял музеяў павінен выкарыстоўвацца педагагічнымі работнікамі ў арганізацыі адукацыйнага працэсу ва ўстанове адукацыі: правядзенні ўрокаў па розных прадметных дысцыплінах, факультатыўных заняткаў, заняткаў у аб’яднаннях па інтарэсах і мерапрыемствах выхаваўчага характару.

Актуальным у рабоце кіраўнікоў музеяў, асабліва ваенна-гістарычнага профілю, з’яўляецца супрацоўніцтва з кіраўнікамі па ваенна-патрыятычнаму выхаванню, што неабходна адлюстроўваць у адпаведным плане работы.

**Мэтазгодна** забяспечыць стварэнне пры музеях пошукавых груп, навуковых таварыстваў, што будзе спрыяць актывізацыі пошукава-даследчага накірунку дзейнасці.

**Асаблівую ўвагу** неабходна звярнуць на далучэнне навучэнцаў да работы па ўвекавечанні і прапагандзе гераічных подзвігаў беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Рэкамендуем працягваць дзейнасць па збору матэрыялу пра лёс сваіх продкаў – ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны, а таксама пра ўдзельнікаў і відавочцаў падзей, якія пражывалі, ці пражываюць на дадзенай тэрыторыі; рабоце з архіўнымі

---

[24] Форма заявы аб выключэнні музейнага прадмета (- аў) з Музейнага фонду Рэспублікі Беларусь размешчана на сайце rcek.by.

[25] Артыкул 177 Кодэкса аб культуры Рэспублікі Беларусь.

дакументамі, абнаўленню тэматычных банкаў дадзеных; папаўненню Кніг памяці і інш.

Найкаштоўнейшым гісторыка-краязнаўчым музейным матэрыялам з'яўляюцца ўспаміны ўдзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны, «дзяцей вайны», іх родных і блізкіх, атрыманыя падчас сустрэч, інтэрв'ю, гутарак і запісаныя на аўдыё- і відэаносьбіты. Таму актуальным застаецца папаўненне фанатэк «Жывыя галасы гісторыі вайны».

**Важнае значэнне** ў рабоце музеяў неабходна надаць арганізацыі і актыўнаму далучэнню дзяцей і моладзі да ўдзелу ў Вахтах Памяці[26].

Правядзенне пошукавых работ на месцах, дзе праходзілі баявыя дзеянні і карныя акцыі, а таксама адкрыццё воінскіх пахаванняў асобамі, якія не ўпаўнаважаныя для гэтага Міністэрствам абароны Рэспублікі Беларусь, катэгарычна **забараняецца**[27].

Адным з напрамкаў у рабоце музея ўстановы адукацыі з'яўляецца ўключэнне навучэнцаў у грамадска-карысную дзейнасць: выкананне работы па ахове помнікаў гісторыі, культуры і прыроды свайго рэгіёна па заданнях музея; добраўпарадкаванне помнікаў; шэфства над ветэранамі вайны і працы, пажылымі людзьмі і інш.

У пазакласнай рабоце матэрыялы музея выкарыстоўваюцца пры падрыхтоўцы юных экскурсаводаў, лектарскіх груп, распрацоўцы тэматыкі масавых мерапрыемстваў, правядзенні мерапрыемстваў прафарыентацыйнай накіраванасці.

Музеі павінны стаць часткай цэласнай сістэмы работы ўстановы адукацыі ў шосты школьны дзень і канікулярны перыяд, што забяспечваецца планамернай працай у напрамку актывізацыі асноўных накірункаў і форм работы музея.

Актывізацыі дзейнасці музеяў устаноў адукацыі спрыяе ўдзел навучэнцаў у раённых, абласных, рэспубліканскіх праектах, акцыях, конкурсах, форумах, выставах і г.д[28].

**Неабходна асаблівую ўвагу** надаваць арганізацыі экскурсійнай работы ў музеях устаноў адукацыі. Рэкамендуецца арганізоўваць узаеманаведванне музеяў навучэнцамі ўстаноў адукацыі, рэалізоўваць сумесныя музейныя праекты, акцыі, мерапрыемствы, уключаць музеі ўстаноў адукацыі ў рэгіянальныя турысцка-экскурсійныя маршруты.

У рабоце музеяў устаноў адукацыі **неабходна шырока выкарыстоўваць** сучасныя інфармацыйныя тэхналогіі.

Формы работы музея ўстановы адукацыі з выкарыстаннем інфармацыйных тэхналогій могуць быць рознымі:

---

[26] Вахта Памяці – скаардынаваная акцыя з удзелам навучэнцаў па нясенню «Вахты Памяці» каля памятных аб'ектаў, а таксама іх удзел у правядзенні разведвальных пошукавых экспедыцый на месцах баёў.

[27] Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 24 сакавіка 2016 г. № 109 «Об увековечении памяти о погибших при защите Отечества и сохранении памяти о жертвах войн».

[28] План правядзення рэспубліканскіх мерапрыемстваў музейнай тэматыкі размешчаны на сайце rcek.by у раздзеле «План мерапрыемстваў».

стварэнне лакальных сайтаў музеяў, асобных старонак на сайтах устаноў адукацыі;

арганізацыя інтэрактыўнай экспазіцыйна-выставачнай прасторы;

распрацоўка qr-кодаў, аўдыё-гідаў, у якіх змяшчаецца інфармацыя аб экспазіцыях музея, асобных музейных прадметах, навукова-дапаможных і сыравінных матэрыялах;

стварэнне электроннай базы дадзеных фондаў музея з магчымасцю пабудовы да іх розных запытаў, апісанне музейных прадметаў, фарміраванне ў фондах музея электроннай бібліятэкі, калекцыі аўдыё- і відэазапісаў, фатаграфій;

фарміраванне электронных каталогаў, якія ўключаюць інфармацыю, звязаную з музейнымі прадметамі, архіўныя дадзеныя, артыкулы, матэрыялы, аб'яднаныя пэўнай тэмай і г.д.;

арганізацыя праектнай дзейнасці, якая прадугледжвае збор матэрыялаў у сетцы інтэрнэту, пошук магчымых «сеткавых» партнёраў музея.

Эфектыўным сродкам сацыялізацыі навучэнцаў з'яўляецца прымяненне ў музеях устаноў адукацыі інтэрактыўных форм работы: віртуальнай экскурсіі, квэст-экскурсіі, тэатралізаванай экскурсіі, экскурсіі «майстар-клас», музейнага свята, квіз тэхналогіі, элементаў дапоўненнай рэальнасці, дэманстрацыі музейных прадметаў у дзеянні і інш.

Музей установы адукацыі можа быць ініцыятарам або актыўным удзельнікам розных музейных акцый: «Дзень сям'і», «Дзень старэйшага пакалення», «Музейнае сэлфі», «Я пакажу табе музей», «Музей у падарунак маме», «Першы наведвальнік выставы» і інш.

Стварэнне музейных сямейных праграм, арганізацыя сямейнага вольнага часу ў музеі, стварэнне сямейных клубаў будзе спрыяць эфектыўнай камунікацыі для рэалізацыі задач сямейнага выхавання.

Адукацыйную і культурна-асветніцкую дзейнасць музеяў устаноў адукацыі **рэкамендуецца** праводзіць ва ўзаемадзеянні з дзяржаўнымі і грамадскімі арганізацыямі, зацікаўленымі асобамі.

**Неабходна забяспечыць** актыўнае ўзаемадзеянне музеяў сістэмы Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь і Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, якое можа заключацца ў сумесным правядзенні мерапрыемстваў: семінараў, аглядаў-конкурсаў, цыклаў экскурсій, прэзентацый, фестываляў, святаў і г.д., а таксама ў аказанні прафесійнай метадычнай і практычнай дапамогі кіраўнікам музеям устаноў адукацыі.

З мэтай далучэння навучэнцаў да музейнай, даследчай і пошукавай работы музеям устаноў адукацыі **рэкамендуецца** праводзіць прэзентацыйныя мерапрыемствы на рэгіянальных і рэспубліканскім узроўнях, папулярызаваць дзейнасць музеяў праз стварэнне віртуальных музеяў, выданне промапрадукцыі: буклетаў, флаераў, даведачных матэрыялаў, тэматычных зборнікаў па арганізацыі музейнай работы ва ўстановах адукацыі.

Папулярызацыі дзейнасці музея будзе садзенічаць стварэнне асобных старонак у сацыяльных сетках, якія адлюстроўваюць дзейнасць музея.

**Звяртаем увагу, што ў мэтах удасканалення і развіцця работы музеяў устаноў адукацыі ўстановам адукацыі сумесна з зацікаўленымі неабходна забяспечыць:**

папаўненне экспазіцый музеяў устаноў адукацыі, якія дзейнічаюць, а таксама стварэнне музейных экспазіцый у кожнай установе адукацыі, у тым ліку прысвечаных гісторыі Вялікай Айчыннай вайны на дадзенай тэрыторыі, генацыду беларускага народа ў гады вайны;

распрацоўку і рэалізацыю рэгіянальных праграм па выкарыстанні ў адукацыйным працэсе патэнцыялу музеяў устаноў адукацыі, у тым ліку ў шосты школьны дзень, вячэрні час, канікулярны перыяд;

арганізацыю сістэмы мерапрыемстваў для павышэння прафесійнага майстэрства кіраўнікоў музеяў;

удасканаленне работы па арганізацыі камплектавання і ўліку музейных фондаў у адпаведнасці з патрабаваннямі;

укараненне ў практыку музейнай дзейнасці інавацыйных і інтэрактыўных форм работы ў музеі ўстановы адукацыі і іх трансляцыя;

сістэмнае правядзенне мерапрыемстваў, накіраваных на прэзентацыю дасягненняў у галіне музейнай педагогікі і папулярызацыю дзейнасці музеяў ва ўстановах адукацыі як адукацыйнай прасторы і рэсурса ў патрыятычным выхаванні дзяцей і моладзі;

выкарыстанне магчымасцяў інтэрактыўнай платформы «Патрыёт.by», у тым ліку размешчаных ў модулях платформы разнастайных матэрыялаў, а таксама пры правядзенні тэматычных мерапрыемстваў для іх асвятлення і арганізацыі шырокага кола ўдзельнікаў;

распрацоўку турысцка-экскурсійных праграм з улікам патрабаванняў узроставых і індывідуальных асаблівасцей навучэнцаў, з уключэннем у праграмы наведванне музеяў устаноў адукацыі;

стварэнне і пастаяннае абнаўленне сайтаў музеяў, раздзелаў «Музей» на інтэрнэт-сайтах устаноў адукацыі;

умацаванне матэрыяльна-тэхнічнай базы музеяў устаноў адукацыі, абнаўленне экспазіцый музеяў устаноў адукацыі ў адпаведнасці з сучаснымі патрабаваннямі;

узаемадзеянне з установамі культуры і іншымі ўстановамі (арганізацыямі);

кантроль за эфектыўнасцю дзейнасці музеяў устаноў адукацыі.